площадью. Но в малой его душе поэзия лежала ничком, ибо негде ей было повернуться» («Блистающий мир»). И далее: «Сторож заговорил нараспев:

В ветро-весеннем зное,
Облачась облаком белым.
Покину царство земное
И в подземное сойду смело…

Затем приводятся слова Друда, который в ответ на вопрос Стеббса о впечатлении, произведенном на Друда стихами поэта, ответил: “Никакого: …Твои стихи подобно тупой пиле, дергают душу, не разделяя ее. Творить – это, ведь, - р а з д е л я т ь , вводя с в о е в массу чужой души…” (“Бегущая по волнам”). Отношение Друда к стихам Стеббса – это отношение писателя к поэзии такого рода.

Наблюдение над характером функционирования сложных прилагательных в художественном тексте позволяет подойти к их изучению с позиции выявления некоторых стилеобразующих характеристик, поскольку в художественном произведении носителями образности могут становиться все стороны лексико-грамматической природы слова.

І.І. Навасельцава

## КОЛЕР ЯК ЭЛЕМЕНТ ЭСТЭТЫЧНАЙ КАНЦЭПЦЫІ НІЛА ГІЛЕВІЧА

У кожнага творцы сваё бачанне свету, а значыць і свае спосабы і сродкі адлюстравання рэчаіснасці, адкрыцця мастацкай энергіі слова, у якім “і пластыка, і музыка, і фарбы, і тое, чаго нідзе і ні ў чым няма – сэнс, адухоўленасць, страснасць” [13, с. 200]. Выбар і ўжыванне слоў вызначае не толькі індывідуальны стыль мастака, але і характарызуе культурныя асаблівасці таго этнічнага арэала, у які ўваходзіць пісьменнік як моўная асоба. Акадэмік В.У. Вінаградаў зазначаў, што “словаўжыванне пісьменніка абумоўлена яго ўменнем знаходзіць неабходны і характэрны для адпаведнай мастацкай задумы спосаб вобразнага абагульнення прадмета, з’явы, асобы, дзеяння” [1, с. 17], аднак апісанне разнастайных рэалій не можа быць поўным, дакладным без выкарыстання лексікі са

значэннем колеру. Нямецкі паэт і вучоны І.В. Гётэ, заснавальнік тэорыі колераў, сцвярджаў, што “колер аказвае пэўнае ўздзеянне на пачуцце зроку, а праз яго і на душу: здольны выклікаць пачуцці, абуджаць эмоцыі і думкі, якія нас супакойваюць або хвалююць, прымушаюць смуткаваць або радавацца” [12, с. 240]. Таму бачанне навакольнага свету ў колерах вымагае ад пісьменніка не толькі добрага валодання моўнымі сродкамі для перадачы разнастайных адценняў, але і асабістага прыроднага таленту да колерапісу словам.

Сістэма моўна-выяўленчых сродкаў народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча шматгранная і гарманічна скампанаваная. Неад’емная частка слоўніка паэта – лексіка колераабазначэння, якая вылучаецца эмацыянальна-сэнсавай змястоўнасцю, раскрывае эстэтычныя погляды Ніла Гілевіча. Колеравая палітра паэта паліхромная, аднак ахраматычныя колеры пераважаюць.

Асноўным крытэрыем прыгажосці ў класічнай эстэтыцы лічыцца ізаляваны колер. Яшчэ Г. Гегель адзначаў, што колеры павінны быць “яснымі, вызначанымі і простымі, бо найбольш простыя колеры якраз і складаюць пачуццёвы бок прыгажосці, выяўляюць самае моцнае ўражанне” [2, с. 261]. У сістэме колерапісу Ніла Гілевіча ізаляваны колер – адзін з асноўных кампанентаў, які “выступае адносна незалежным носьбітам пэўнага настрою, ідэйна-вобразнага зместу” [10, с. 85].

Аб’ект аўтарскага захаплення – *белы* колер, самы частотны ў мове паэта. У еўрапейскіх народаў гэты колер атаясамліваецца з найвышэйшай святасцю, сімвалізуе “чысціню, нявіннасць, згоду, святло, мудрасць, бязвіннасць і праўду” [14, с. 61], гармонію, традыцыі, веру, мір, ачышчальную ваду, а ў славян гэта яшчэ і ўвасабленне духоўнай велічы. Сярод лексікі з колеракодам “*белы*” ў мове паэта дамінуюць прыметнікі, што ўжываюцца як у ролі азначэння-назвы колеру (*У небе стайка **белых галубоў** над разамлелаю зямлёй уецца* [3, с. 41]; *У чыстым **белым** ільняным **уборы**, / Дарогаю, што ў лужынах была, / У горад Маці крывічоў ішла* [9, с. 186]), так і ў якасці азначэння-эпітэта (*Я глядзеў на **белае каменне**, / Што з раллі тырчала па зіме. / І з тых **белых знакаў** на імгненне / Словы ўзніклі: “Беларусь жыве!” / І гукнуў я з радасці: “Браты! / Вось ён – сімвал нашай праваты* [9, с. 120]; *А хоць бы хто, а хоць бы дзе / Азваўся словам забалелым/– У незлічонай грамадзе, / У неаглядным **свеце белым*** [9, с. 159]).

Паўтарэнне ў кантэксце прыметніка *белы* павышае адчуванне ізаляванасці, дазваляе паэту дакладна і тонка перадаць магію прыгажосці

беларускай прыроды ў час панавання зімы, заварожвае, напаўняе душу спакоем, прадчуваннем здзяйснення чагосьці радаснага, доўгачаканага, патаемнага: ***Белыя*** *сыплюцца долу* ***крышталікі****, /* ***Белыя*** *крышацца* ***хмаркі*** *ўгары. / Сосны ахутаны ў* ***белыя шалікі****. /* ***Белая мітусь*** *у* ***белым бары****. /* ***Белая****, мяккая* ***ціша*** *няхрусткая, /* ***Белай дрымотай*** *спавіты кусты. /* ***Белая казка****... Зіма беларуская... / Што ж мне не дорыш снягурачку ты?..* [3, с. 335], а таксама стварае атмасферу святочнасці, урачыстасці, узнёсласці, першароднай чысціні: *Для гасцей* ***абрус*** *у нас / Сцелюць гэтакі якраз* ***белы-белы*** [3, с. 149]; *Каб над зямлёй, што млела ў ранах, / ... Цвіў гэты* ***белы-белы май*** [5, с. 31].

*Чорны* колер, традыцыйны сімвал гора, цяжару, жалобы, ужываецца паэтам пры характарыстыцы пэўных з’яў, псіхалагічнага стану, якасцей герояў: *Божа, колькі* ***чорных гадзюк*** *за жыццё прыгарнуў да грудзей!* [9, с. 89]; *А на душы ад* ***чорных думак чорна*** [9, с. 183]; *На трыбуну, як на эшафот, /* ***Чорны страх*** *па чарзе іх выводзіў* [9, с. 90].

Важны і па-мастацку матываваны аўтарскі прыём – нагнятанне *чорнага* колеру, у выніку чаго развіваецца абагульнена-сімвалічнае значэнне, перадаюцца адмоўныя канатацыі. У вершы “Балада ў Чорным” паўтор тых самых ці аднакаранёвых слоў дакладна перадае трагічнасць сітуацыі, спрыяе выразнаму выяўленню інфарматыўнага і эстэтычнага напаўнення вершаванага радка: ***Чорныя палкоўнікі****, / Чыняць* ***чорны гвалт****, / Чорныя іх* ***постаці*** *– /* ***Чорныя суды****. /* ***Чорныя апосталы*** */ Гора і бяды! /* ***Ачарніць*** *не брыдка ім / Нават і Хрыста – /* ***Чорнымі адбіткамі*** */ З* ***чорнага ліста****. /* ***Чорных полаў*** *цемрыва. /* ***Чорных колаў*** *лязг. / Дула рэвальвернага /* ***Варанёвы бляск****. / Вязніца халодная – /* ***Цёмны-цёмны*** *склеп. / Стужачка жалобная – /* ***Чорны-чорны крэп****. / Нават неба зорнае не цвіце ўгары: / Як* ***вуголле чорнае*** */ Размялі вятры. /* ***Чорная Мядзведзіца****. /* ***Чорны Млечны Шлях****...* [3, с. 294]. Колеракод “*чорны*” выконвае ў вершы ролю эмацыянальна-ацэначнага пульсара, своеасаблівай апоры цэласнага экспрэсіўнага абрамлення ўсяго тэксту.

Пры апісанні адзення *чорнага* колеру паэт пераносіць колеравую адзнаку з адзення на аблічча персанажа, надаючы вобразу дадатковае адмоўнае ацэначнае значэнне “той, хто нясе зло, варожасць, небяспеку, гвалт”: ***Нехта ў чорным****, дробнай косці / З Гебельса навелькі, / Поўны шалу, поўны злосці, / Нас трасе за пелькі* [8, с. 96].

Колеракод “*шэры*” паэт ужывае і ў якасці сродку намінацыі (*Па* ***шэрых руінах*** *– астатках былога страхоцця – / Бязбоязна лазіць / Вяснушчаты / Заўтрашні / Дзень* [3, с. 231]), і ў якасці сродку выражэння

эмацыянальна-экспрэсіўных ацэнак рэчаіснасці ў значэнні “невыразны, нецікавы, непрыязны, сумны”: *Толькі золь. Толькі **шэрая стынь**. / Ды варон у прысадах вячэрня* [9, с. 125]; *О, сябры таленавіта-розныя! / Песнятворцы **міжчасоўя шэрага***! [9, с. 179].

Храматычная група каларатываў у мове паэта па колькасці займае другое месца і прадстаўлена наступным чынам: *чырвоны, ружовы, жоўты, залаты, зялёны, сіні* колеры.

*Чырвоны* колер спрадвеку асноўны для славян, сімвалізуе агонь, сонца, Бога Ярылу, вечнае жыццё, выкарыстоўваецца ў беларускім нацыянальным ткацтве, адзенні, мастацтве. Са станоўчай канатацыяй паэт выкарыстоўвае *чырвоны* колер у асноўным у якасці сродку намінацыі, зрэдку – метафарызацыі: *Ах, як добра Манечцы / Бегаць па дзядзінцы, / На галоўцы маючы / **Каснічок чырвоны*** [5, с. 109]; *Ці не **полымя** гэта – **чырвоны** той **шоўк**?* [3, с. 61]. Прыметнік *крывавы* “ярка-чырвоны, колеру крыві” паэт ужывае для стварэння адмоўнай канатацыі вобразаў, перадаючы пачуццё трывогі, усеагульнага гора: *Усё шырэй **крывавыя кругі** / І там і сям расходзяцца па краі* [9, с. 316]; *Апошні **крывавы пажар** на Радзіме* [5, с. 263]. Таму слушна заўважае Л. Міронава, што “чырвоны колер у ХХ стагоддзі робіцца носьбітам негатыўных сэнсаў і крыніцай пераважна непрыемных асацыяцый” [12, с. 47]: *Па ўсім па краі родным / Ляціць **чырвоны снег*** [5, с. 68].

Часта Ніл Гілевіч выкарыстоўвае замацаванае ў народнай псіхалогіі, гісторыі і эстэтыцы кантраснае спалучэнне *белага* і *чырвонага*: *Як цябе любяць, упэўніўся, кветкі чароўныя – / Ружы, **чырвоныя** з **белымі**... / Гэтак насустрач імкнуліся – / **Чырванню** ўсёю і ўсёй незямной **белізною*** [9, с. 103]; *Кветкі маміны – вяргіні: / Аж **бел-чырвана** ў двары! / Кветкі мамінай нявесткі. / Сімвал святасці жывы* [9, с. 29].

*Ружовы* колер, што спалучае ў сабе *чырвоны* і *белы*, ужываецца паэтам у намінатыўнай функцыі, са станоўчай канатацыяй: ***Зара ружовая** плыла з-за гор, / І **ружавеў** на раннім ветры твар* [3, с. 19]. *Ружовы* – колер юнацкіх мар, патаемных памкненняў, надзей. У прыкладзе *Пабіты ржой, сук быў адпілаваны / Ад яблыні старой, быў ацярэблены / І кінуты на дол як непатрэбны. / А ён, вясновым сокам набрынялы, / І на зямлі пусціў **ружовы квет**!.. / Так безнадзейна, што ажно заплакаў, / Пазнаўшы ў ім сябе, стары паэт* [9, с. 181] кантэкст сведчыць, што прыметнік *ружовы* паслужыў асновай для развіцця больш глыбокага значэння: “усведамленне хуткаплыннасці жыцця, немагчымасці вярнуць маладосць”.

Колеракод “*жоўты*” выкарыстоўваецца паэтам у асноўным для намінацыі колеру розных прадметаў, з’яў прыроды: *У скверыку ціхім зноў **верасень жоўты*** [9, с. 145]; ***Сосны жоўтыя** тым сонцам мыліся* [9, с. 30]. Такое адценне колеракода “*жоўты*”, як *залаты* “бліскуча-жоўты, як золата” нясе ў мове паэта толькі дадатную ацэнку, выражае захапленне, усхваляванасць, радасць: *Мой **край**, мой рай бульбяна-жытны! / Зеленадолы, **залаты**!* [6, с. 60]; *Што не паспею я сказаць табе – / Даскажуць сонца **залатыя промні*** [7, с. 10]; *Гэта свеціцца сонцам твая **залатая святліца*** [3, с. 276]; *Як успыхнуў, як узвіўся* [**касцёр**] *языкасты, **залаты*** [5, с. 356]; *Цэлы вечар на Выстаўцы я хаджу ўсхваляваны, / Дзе над клумбамі высяцца **залатыя фантаны*** [3, с. 115].

Выкарыстанне *зялёнага* і *сіняга* колераў актывізавана тэматыкай пейзажнай лірыкі паэта, у якой выяўляецца прасторавы характар апісання рэалій. У фальклоры *зялёны* колер сімвалізуе надзею, таму Ніл Гілевіч, прадстаўнік вёскі, эстэтызуе гэты колер пры апісанні лесу, дрэў, нівы, прасторы наогул, якія з’яўляюцца важнымі кампанентамі ў моўнай карціне свету паэта: *Дзень добры, старонка мая дарагая – / **Зялёны**, азёрны, прасторны, прыветлівы **край**!* [9, с. 77]; *Адпусці мяне дамоў – / У **прастор зялёны*** [4, с. 265]; *Яна раптоўна, з **гушчыні зялёнай**, / Насустрач выйшла мне, на сцежку ў травах* [9, с. 107].

Колеракод “*сіні*” ў мове паэта мае станоўчую ацэнку “чысты, ясны, прыгожы” і асацыіруюцца з небам, вадой, бязмежнасцю, часткамі сутак: *Я спяшаўся за табою / **Сінім золкам**, ясным раннем* [7, с. 81]; *Як толькі ноч ліпнёвая / Махне **крыламі сінімі**... / А **неба сіняе** аж **перасінена*** **[**5, с. 188]; *Расступіўся **вечар сіні** ад такога аганька* [5, с. 356]. Пры апісанні неба *сіні* колер часам набывае ў паэта сімвалічнае значэнне смутку, самоты, паказвае на адлегласць, недасягальнасць: *І ў марозную зорную **сінь** / Ты, як воўк адзінокі, завыеш* [8, с. 9].

Асобную групу ў мове твораў Ніла Гілевіча складаюць прыметнікі-кампазіты, што спалучаюць у адно два колеры ці іх адценні, якасныя прыметы прадметаў розных колераў, і выяўляюць фантазію паэта, надаюць тэксту ўзвышаную стылістычную афарбоўку, а паводле характару семантычных адносін аб’яднаных асноў падзяляюцца на дзве групы: утварэнні са спалучальнымі і ўтварэнні з падпарадкавальнымі адносінамі асноў.

Складаныя прыметнікі са значэннем колеру, што аб’яднаныя спалучальнай сувяззю і абазначаюць колер і колеравае адценне прадмета, прадстаўлены наступнымі мадэлямі: 1) адносны (у значэнні якаснага) +

якасны прыметнік: *Хоць пахнуў паранкай* ***праснак*** *і быў* ***зямліста-шэры*** *– / Я і дагэтуль помню смак сіроцкай той вячэры* [5, с. 19]; ***Агніста-барвовым****, нявыцвілым, / Яркім усходзіла* ***сонца*** *над ліпавым паркам* [3, с. 155]; 2) якасны + якасны прыметнік: *На столі, бы ў небе, –* ***блакітна-ружовыя зоры*** [3, с. 270]; *На камені чорным, / Над* ***бела-блакітнай раўнечай вады****, / Як на пастаменце – / Фігурысты лебедзь: / Прыгожы, паважны і немалады* [9, с. 52]; 3) якасны + адносны (у значэнні якаснага): *Стаяў – задыханы, увесь абсыпаны / Не руж пялёсткамі, не з лаўра лісцем – /* ***Пяском – бялёса-залацістым****, чыстым* [7, с. 67]; *Чыстая прынцэса!.. / З* ***блакітна-васільковымі вачыма*** [9, с. 284].

Складаныя прыметнікі-колераабазначэнні з падпарадкавальнымі адносінамі асноў утвораны з дзвюх асноў, дзе першая ўдакладняе другую – апорны кампанент: *Іду, а неба – нізкае, а* ***ночка*** *–* ***сінякрылая*** [5, с. 19]; *Клёны, ясені спяць, / Сны шчаслівыя сняць, /* ***Вечар*** *іх атуліў* ***шызакрылы*** [4, с. 247]; *Шчасліва-клапатлівая манголка / Увішна, спрытна перапеляноўвае /* ***Маслінавокага сынка-анёлка*** [7, с. 70]; ***Жаўталістым ранкам****, на Пакровы / У святы багаславёны дзень, / Ты сказала, што закон суровы / Не пакінуў месца для надзей* [9, с. 146].

У мове паэта складаныя прыметнікі са значэннем колеру адыгрываюць ролю нечаканых і адзінкавых у сваім родзе эпітэтаў, што з'явіліся ў выніку ўдумлівага вывучэння і асэнсавання матэрыяльнага свету, утвараюць сабой своеасаблівую сінтагму, кампаненты якой выражаюць якасна новае паняцце-характарыстыку.

Вынікам індывідуальна-мастацкага бачання свету з'яўляюцца перыфразы паэта, якія базіруюцца на метафарычным значэнні граматычна апорнага кампанента, што ўзнікае праз падабенства знешніх прымет, выражаных якасным прыметнікам са значэннем колеру: *Маладыя яблыні каля школы ўкруг / Пальцамі пазяблымі ловяць* ***белы пух*** (снег) [3, с. 37]; *З мамаю ціхусенька Манечка ляжала – / Цёк па шыйцы худзенькай /* ***Каснічок чырвоны*** (кроў) [5, с. 110]; ***Зялёныя*** *чэрвень* ***кілімы*** (трава) *рассцеле* [4, с. 230]. Каларатывы-перыфразы з коранем -*залат*- не толькі рэалізуюць зрокавае ўспрыманне вобраза, але і выяўляюць адмысловае індывідуальна-аўтарскае бачанне свету: *Спі, мая лугавая, мая* ***залатая мядуначка*** (каханая) [3, с. 343]; *Той, якую любіў і лю-блю, / Дай здароўя, адхланнасці дай / І яе* ***залаты адвячорак*** (старасць) */ Як мага надаўжэй затрымай!..* [9, с. 193]; *Вось і сонца шар на ўсходзе, / За сцяною бору, /* ***Залатыя стрэлы*** (промні) *узводзіць / У прастор, угору* [3, с. 28].

Пры дапамозе колеравых дзеяслоўных метафар паэт характарызуе разнастайныя з’явы прыроды, ствараючы тым самым адмысловыя пейзажныя замалёўкі, надаючы апісанню дынамічны характар: *Мяне сцяжынка ўжо вяла дадому, / У бацькаў двор аселіцай вяла, / Дзе на траве* ***бялеюць*** *ранкам* ***росы*** [3, с. 135]; ***Чырванелі*** *гронкамі каля хат* ***рабіны*** [4, с. 275]; *А* ***снег*** *па лапцю валіць – / Бахматы і густы, / Не* ***беліць****, а* ***крывавіць*** *– / Падворкі і платы...* [5, с. 68]; ***Пачатак лета зеляніўся*** *буйна* [3, с. 230]; *А на стале – як лёсу выклік – /* ***Сінелі кветкі-васількі*** [6, с. 142].

Такім чынам, колер у мове паэта непасрэдна звязаны з адлюстраваннем жыццёва важных падзей і з’яў, дапамагае кампактна ахарактарызаваць якасць, уласцівасць прадмета, стварыць станоўчае ці адмоўнае ўздзеянне на чытача, дакладна і тонка перадаць зрокавае ўспрыманне вобраза, яго суладнасць, гармонію, адпавядае і агульначалавечым уяўленням аб прыгожым, і сістэме колеравых сімвалаў беларускіх народных традыцый. Прыярытэтны выбар ахраматычных колераў сведчыць пра рэалістычнае светаўспрыманне Ніла Гілевіча, пры гэтым многія колераабазначэнні набываюць у кантэксце паэта канатацыі індывідуальна-аўтарскага характару, нясуць значную канцэптуальную, ідэйна-тэматычную і эстэтычную нагрузку, дапамагаючы чытачу праз прызму аўтарскіх асацыяцый лепш спазнаць свет, лепш яго адчуць і ўспрыняць. Багацце лексічнай колеравай палітры паэта, яе сімвалічная насычанасць у сукупнасці з іншымі моўнымі сродкамі вызначае адметнасць індывідуальнага стылю Ніла Гілевіча, яго высокае слоўнае майстэрства, эстэтычны густ і самабытнасць колераўспрымання.

**Літаратура**


1. Виноградов В.В. Язык художественных произведений // Вопросы языкознания. М., 1957. № 5. С. 17–25.
2. Гегель Г.В.Ф. Эстетика: В 4-х т. Т.1. М., 1968. 312 с.
3. Гілевіч Н. Выбраныя творы ў 2-х т. Вершы і паэмы. Т.1. Мінск, 1981. 462 с.
4. Гілевіч Н. Выбраныя творы ў 2-х т. Вершы і паэмы. Т.2. Мінск, 1981. 366 с.
5. Гілевіч Н. Выбраныя творы ў 2-х т. Вершы і паэмы. Т.1. Мінск, 1991. 478 с.
6. Гілевіч Н. Выбраныя творы ў 2-х т. Вершы і паэмы. Т.2. Мінск, 1991. 470 с.
7. Гілевіч Н. Повязь. Мінск, 1984. 110 с.
8. Гілевіч Н. На высокім алтары. Мінск, 1994. 143 с.
9. Гілевіч Н. Збор твораў. Т.3. Мінск, 2001. 350 с.
10. Зайцев А.С. Наука о цвете и живопись. М., 1986. 159 с.
11. Лихтенштадт В. О Гете. Борьба за реалистическое мировоззрение. Искания и достижения в области изучения природы и теории познания. Пг., 1920. 500 с.
12. Миронова Л.Н. Цветоведение. Мінск, 1984. 286 с.
13. Сачанка Б. Жывое жыццё. Мінск, 1985. 260 с.
14. Фоли Джон. Энциклопедия знаков и символов. М., 1996. 315 с.